✓**11 студзеня** ў Музеі кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адкрылася выстава **«У краіне мар»**, прымеркаваная да 130-годдзя з дня нараджэння выбітнай беларускай паэтэсы Канстанцыі Буйло (1893 – 1986).

Выстава падрыхтавана сумесна Нацыянальнай



бібліятэкай Беларусі, Дзяржаўным літаратурным музеем Янкі Купалы, Дзяржаўным музеем гісторыі беларускай літаратуры. Яна распавядае пра жыццёвы шлях і творчыя пошукі Канстанцыі Буйло ад першых вершаў у перыядычным друку і дэбютнага зборніка «Курганная кветка» (1914) да выданняў твораў 1950 –1980-х гг.

Сярод экспанатаў – першы зборнік паэткі «Курганная кветка», які выйшаў з рэдактарскага дабраслаўлення Янкі Купалы, у мастацкім афармленні вядомага беларускага мастака Язэпа Драздовіча. Шэраг выданняў з музейных і бібліятэчнага фондаў – з дароўнымі надпісамі. Жыццёвую і творчую гісторыю дапаўняюць фотаздымкі і аўтарскія рукапісы. Сярод іх вершы з прысвячэннямі Янку Купалу і перапіска Канстанцыі Буйло з Уладзіславай Луцэвіч. Асаблівую каштоўнасць маюць асабістыя рэчы, якія беражліва захаваў і перадаў у музейныя зборы сын паэткі.

Лепшыя творы Канстанцыі Буйло ўваходзяць у анталогію беларускай лірыкі. Менавіта з яе вершамі ў гісторыі беларускай паэзіі пачатку XX ст. звязваюць росквіт лірыкі кахання.

Выстава будзе працаваць да 31 сакавіка.

Яе дапаўняе кніжная выстава **«Люблю наш край – старонку гэту...»**, што адкрылася **10 студзеня** ў зале беларускай літаратуры бібліятэкі.

*Люблю наш край –*
*старонку гэту,*
*Дзе я радзілася, расла,*
*Дзе першы раз*
*пазнала шчасце,*
*Слязу нядолі праліла.*

Гэта першыя радкі верша паэтэсы «Люблю». Твор, пакладзены на музыку Міколам Равенскім, спраўджвае словы Сяргея Грахоўскага, што гэту песню будуць спяваць, пакуль на свеце жыцьме хоць адзін беларус.

Вершы паэтэсы сталі класікай, час не мае над імі ўлады. Яе паэтычны голас чыста, высока і ўпэўнена гучыць у хоры майстроў беларускай паэзіі.

Эмацыянальны пачатак, вобразна-экспрэсіўныя элементы выразна выступаюць у рамантычных вершах, інтымнай і патрыятычнай лірыцы («Люблю», «Беларусі», «Звон», «Курганная кветка», «Ляці, думка», «Ці помніш ты?»). Матывы любові да Бацькаўшчыны, лёс чалавека і роднага народа, яго мовы і культуры – асноўныя тэмы твораў, што ўвайшлі ў зборнікі «Світанне», «На адноўленай зямлі», «Май», «Роднаму краю», «Вясной» і інш. Для дзяцей яна выдала зборнікі «Юрачка», «У бляску зор». Гэтыя і іншыя творы прадстаўлены на выставе ў раздзеле «Еднасць з роднай зямлёй».

Наведвальнікам бібліятэкі цікава будзе пазнаёміцца з матэрыяламі аб жыцці і творчасці паэтэсы ў раздзеле «Слова павагі і любові». Гэта апублікаваныя ў розныя часы артыкулы А. Гардзіцкага, Д. Чаркасавай, С. Грахоўскага і інш.

Выстава працуе па 14 лютага.